# ГАЗЕТА, З ЯКОЙ ЗДЗЯЙСНЯЮЦЦА МАРЫ



Рэдакцыя газеты «Мы і час» знаходзіцца ва ўніверсітэце на першым паверсе, такі маленькі і ўтульны кабінецік з наборам неабходных у сучаснай рэдакцыі атрыбутаў: камп'ютарнай тэхнікі, даведачнай літаратуры, слоўнікаў ды, зразумела, чайніка і кубачкаў – без кавы або чаю якая можа быць праца ў зладжаным калектыве?!

Але кава-паўза – гэта толькі імгненне, кароткі перадых. Тут заўсёды людна, тут пануе атмасфера рабочага настрою і дружалюбнасці, тут, у рэдакцыі, вам заўсёды рады. Таму і не дзіва, што нашы студэнты журналісцкай (кажу не літаральна) спецыяльнасці з радасцю наведвалі рэдакцыю, яшчэ з большай ахвотай уключаліся ў жыццё газеты, атрымлівалі заданні, пісалі, як тады здавалася, выключна таленавітыя тэксты, якія, крый божа, хто-небудзь пакрэсліць або паправіць. Зразумела, адзіным і асноўным «праўшчыкам» была рэдактар газеты Н.П. Лазебная, сама з высокай унутранай філалагічнай культурай, педагагічным тактам і ўменнем вытрымаць настаўніцкую паўзу, якая такіх тэкстаў прачытала і паправіла вялікае мноства. Выкладчыкі ведалі, калі пасля званка журналісцкая група не ў поўным складзе, дык гэта часова і прычына адна: студэнты могуць быць толькі ў рэдакцыі.

Увогуле, журналісцкая прафесія, якой нашы студэнты вучыліся ў Настассі Пятроўны, стала для многіх справай жыцця. Многія з нашых выпускнікоў і сёння на журналісцкім хлебе, на розных пасадах у друкаваных і электронных сродках масавай інфармацыі. Жаданні збыліся, а набыты вопыт спатрэбіўся. Пагэтаму пра газету можна сказаць і так: газета, з якой здзяйсняюцца мары.

Газета «Мы і час» – сучаснае масмедыйнае выданне, з вабным і яркім дызайнам, заўсёды змястоўная, з высокай філалагічнай культурай, з далікатнай павагай да свайго чытача і з дбаннем пра сваё імя і свой аўтарытэт. Тут так усё спрыяльна сышлося: і прафесійны калектыў, і ўмелае кіраўніцтва дасведчанага, адмысловага ў сваёй справе журналіста – Настассі Пятроўны Лазебнай. Ды сышлося і яшчэ: адначасова Настасся Пятроўна і празаік, і паэт, і гумарыст, і майстар пэндзля – з несумненным талентам педагога. Цяпер у рэдакцыі, акрамя Настассі Пятроўны Лазебнай, працуюць нашы выпускніцы, абедзве выдатніцы, абедзве яркія ў мінулым студэнткі – Алеся Дуброўская і Таццяна Дубоўская. У Алесі Дуброўскай больш вопыту і больш публікацый. У Тані Дубоўскай за плячамі аспірантура ды абарона кандыдацкай дысертацыі, яна – кандыдат філалагічных навук. Хай жа так і будзе: выдатны калектыў – для пачэснай працы на многія гады! З юбілеем, шаноўная газета!

**В.І. НЕСЦЯРОВІЧ,**
**дацэнт кафедры**
**беларускага**
**мовазнаўства.**

**Уважаемые сотрудники редакции**